[1] Швыдкой М.Е. Традиции гуманизма и мировой театр (50-80-е годы XX века): Автовреф. дис. ... д-ра искусствоведения: 17.00.01/ВНИИ искусствознания. - М., 1991. - С. 21.
[2] Вилар Ж. О театральной традиции. – М., 1956. - С. 27.
[3] Бояджиева Л.В. Макс Рейнградт – режиссер-новатор: (Формирование принципов синтетического театра 1901-1909 годов): Автореф. дис. ... канд. искусствоведения: 17.00.01/Гос. ин-т театрального искусства им. А.В. Луначарского. - М., 1974. - С. 5.

# ХАРЭАГРАФІЧНАЕ МАСТАЦТВА І ЭСТЭТЫЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ АСОБЫ

**Г.М. Водчыц**

## ПРАБЛЕМА МАРАЛЬНА-ЭСТЭТЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ АСОБЫ СРОДКАМІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ХАРЭАГРАФІІ

Вырашэнне праблемы маральна-эстэтычнага развіцця асобы сродкамі нацыянальнай харэаграфіі звязана ў першую чаргу з пытаннямі эстэтычнага выхавання ў працэсе заняткаў танцам у аматарскіх калектывах і школах. У больш агульным сэнсе яно датычыцца праблем выхавання нацыянальнай самасвядомасці, павагі да культуры свайго народа, ведання традыцыйнага мастацтва, якія павінны вырашацца комплексна ўсімі ўстановамі культуры і адукацыі.

Выступленне дзіцячых аматарскіх калектываў - гэта заўсёды свята для юных артыстаў і іх гледачоў. Людзей, якія прыходзяць на канцэрты, прываблiваюць у першую чаргу непасрэднасць і эмацыянальнасць, з якімі маленькія выканаўцы робяць свае першыя крокі ў мастацтве. Гэта відовішча дазваляе на нейкі час забыцца на тыя праблемы, з якімі сутыкаецца сучаснае аматарскае мастацтва: адсутнасць фінансавых сродкаў, недастатковая колькасць канцэртаў і новых арыгінальных нумароў, якія б падабаліся дзецям і былі цікавыя дарослым, непрэстыжнасць народных танцаў сярод іншых відаў сучаснай харэаграфіі.

Нельга абвінавачваць сучасную моладзь ў тым, што яна цураецца свайго нацыянальнага мастацтва, што ім больш да спадобы супермодныя рытмы, а беларускія танцы зведзены ў ранг непрэстыжных. Уся справа у тым, што ў нас страчана бытавая танцавальная традыцыя. З усяго арсенала нацыянальных танцаў зараз неяк існуе полька, і то ў самай прымітыўнай форме. Такое няведанне традыцый датычыцца не толькі моладзі, але і больш сталых людзей, якія забыліся на сваё нацыянальнае, больш таго, ніколі не ведалі і не разумелі асаблівасцей і значнасці роднай культуры, таму былі няздольны прывіць любоў да народнага мастацтва сваім дзецям. Вынікі такой палітыкі мы і назіраем сёння, калі наша моладзь не



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лічыцца з законамі і звычаямі той зямлі, на якой жыве, не паважае вопыт сваіх продкаў.

Не суцяшае і стан сучаснага сцэнічнага харэаграфічнага мастацтва, як аматарскага, так і прафесійнага, якое рэдка прадстаўляе дастойныя ўзоры апрацоўкі беларускіх танцаў. Часцей за ўсё нам прапануюць даволі ўмела скампанаваныя з рухаў і трукаў, якія ўваходзяць у арсенал народна-сцэнічнага танца, і таму вельмі падобныя паміж сабой танцы. Беларускія балетмайстары пры стварэнні харэаграфічных твораў усё менш звяртаюцца да фальклорных крыніц, а калі гэта і адбываецца, не звяртаюць увагі на рэгіянальныя асаблівасці існавання і выканання таго ці іншага ўзора народнай творчасці. Яны жадаюць як мага хутчэй і з меншымі затратамі дасягнуць поспеху і таму выкарыстоўваюць правераныя сродкі, чужыя знаходкі, імкнуцца да відовішчнасці. Выкананне і ўспрыманне такіх сцэнічных твораў не толькі не дае задавальнення, але і ўмацоўвае стэрэатып непрэстыжнасці, нібыта беларускія танцы не адпавядаюць патрабаванням сучаснікаў. Гэта спрыяе ўкараненню духоўнай беднасці і абыякавасці да нацыянальнай культуры. Таму мы ў чарговы раз рэкамендуем балетмайстарам больш актыўна і творча выкарыстоўваць узоры рэгіянальных традыцыйных танцаў.

Фальклор - гэта не толькі відовішча, але ў першую чаргу скарбніца, у якой сабраны стагадовы вопыт продкаў ва ўсіх відах жыццядзейнасці, і ў тым ліку ў выхаванні дзяцей, перадачы ведаў, выпрацоўцы нормаў паводзін ў чалавечым грамадстве. Таму зварот да фальклорнай харэаграфіі пры стварэнні сцэнічных твораў, як і ўсе спробы аднавіць бытавую танцавальную традыцыю, будуць спрыяць развіццю цэльнай асобы, якая будзе ведаць нацыянальныя традыцыі і цярпіма ставіцца да культур іншых народаў.

Акрамя звароту да праблем, нельга абыйсці ўвагай і тыя станоўчыя працэсы, якія адбываліся ў беларускай сцэнічнай і народнай харэаграфіі на працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў. Адным з найбольш значных дасягненняў аматарскага мастацтва можна лічыць стварэнне спецыяльнага дзіцячага рэпертуару на аснове інтэрпрэтацыі беларускіх танцаў і ўзораў дзіцячага фальклору. Такім чынам былі вырашаны адразу два пытанні: пашырэнне кола крыніц для інтэрпрэтацыі і пошук арыгінальнасці і самабытнасці танцавальнымі калектывамі. Удзельнікі гэтакіх калектываў далучаюцца да нацыянальнага мастацтва, выхоўваюцца на яго лепшых узорах. Выкарыстанне твораў дзіцячага фальклору дапамагае стварыць цікавыя творы, якія адпавядаюць узроўню мыслення, развіцця і ўспрымання дзяцей, аперыруюць колам яркіх казачных вобразаў, ствараюць атмасферу радасці і больш адпавядаюць выканальніцкім магчымасцям дзіцяці, чым нумары перанесеныя з рэпертуару дарослых калектываў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыкладам такога падыходу да інтэрпрэтацыі фальклору з'яўляецца дзейнасць ансамбля "Весялушка" (г. Мінск, мастацкія кіраўнікі І. і С. Дарохіны) і ансамбля "Роўніца" (г. Барысаў, мастацкія кіраўнікі Н.Буйко і А.Цюцюнава. Назвы твораў з рэпертуараў гэтых калектываў гавораць самі за сябе: "Мурашыная будоўля", "Вераб'і і лежань", "Упартыя конікі", "Кавалік", "Пчолка" і інш., яны нібы сышлі да нас са старонак прыгожых дзіцячых кніжак.

Яшчэ адной станоўчай з'явай у развіцці беларускай харэаграфіі апошніх гадоў можна назваць правядзенне шэрага рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных фальклорных фестываляў, на якіх прадстаўляюцца як традыцыйныя, так і сцэнічныя танцавальныя творы. Адзіным шляхам перадачы фальклорнага танца заўсёды было сумеснае стварэнне яго дарослымі і дзецьмі ў час выканання. Таму вельмі радуе творчы вопыт, які атрымліваюць дзеці - удзельнікі этнаграфічных і фальклорных калектываў. Найбольш цікавай нам здаецца праца фальклорнага ансамбля Мётчанскай сярэдняй школы Барысаўскага раёна. Тут дзеці не толькі вывучаюць традыцыі свайго краю, але і атрымліваюць комплекснае выхаванне. Яны назіраюць за тым, як танцуюць старэйшыя вяскоўцы, пераймаюць іх манеру выканання, навучаюцца спяваць, іграць на музычных інструментах, насіць святочныя строі, паводзіць сябе адпаведна святочнай атмасферы выступлення перад аўдыторыяй гледачоў. Удзел у рабоце падобнага калектыву спрыяе раскрыццю творчага патэнцыялу асобы. Акрамя вывучэння танцавальнай традыцыі, дзеці атрымліваюць навыкі імправізацыі, калектыўнай творчасці, адбываецца фарміраванне эстэтычнага ідэалу, выхаванне лепшых маральных якасцей. Стваральнікам і кіраўніком калектыву з'яўляецца М.Козенка. Акрамя гэтага, ён аўтар ідэі правядзення конкурсу выканаўцаў народнага бытавога танца ў рамках першага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», сутнасць якога ў распаўсюджванні ўзораў традыцыйных танцаў і пашырэнні кола ўдзельнікаў сярод навучэнцаў школ. Галоўнай задачай, якую вырашае гэта спаборніцтва, з'яўляецца папулярызацыя ўзораў беларускай харэаграфіі, для чаго М. Козенка запазычыў прыёмы конкурсаў спартыўных танцаў: абавязковую колькасць танцаў, парнае выкананне. Адзінае, што насцярожвае, ці не прывядзе гэта да забыцця сваёй народнай манеры, да захаплення тэхнічным бокам выканання, як гэта здарылася ў харэаграфічным аматарскім мастацтве.

Не апошняе месца ў фарміраванні новага эстэтычнага ідэалу, у суадносінах з нацыянальнай ідэяй, належыць сучасным інфармацыйным сістэмам, асабліва тэлебачанню. Тэлевізійныя фестывалі, такія як "Залатыя ключы", "Белыя росы", "Усе мы родам з дзяцінства" не толькі знаёмяць гледача з дзейнасцю аматарскіх калектываў, але і фарміруюць харэаграфічныя штампы, спрыяюць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыражыраванню сцэнічных харэаграфічных твораў, часам не адпавядаючых патрабаванням арыгінальнасці, наватарства, выкарыстання рэгіянальных узораў фальклорных танцаў. Такім чынам, пад шыльдай лаўрэатаў і дыпламантаў конкурсаў нам прапануюць не лепшыя па сваёй мастацкай вартасці ўзоры сцэнічных танцаў, чым зніжаюць вартасць нацыянальнага мастацтва. Акрамя гэтага, дзеячы беларускага тэлебачання не ў лепшым выглядзе прадстаўляюць традыцыйнае фальклорнае мастацтва ў перадачах «Запрашаем на вячоркі» і «Радавод», у якіх прапануюць стандартны набор адных і тых жа ўзораў народнай танцавальнай творчасці, вырваных з умоў, у якіх яны звычайна існуюць і выконваюцца. Фальклорнае мастацтва не разлічана на ўспрыманне з боку. Толькі ў выпадку актыўнага ўдзелу ў агульным дзеянні стварэння і выканання фальклорнага твора чалавек можа ацаніць усё хараство яго прастаты. Нам здаецца, што памылка арганізатараў фестываляў і тэлевізійных праграм з удзелам фальклорных калектываў у няправільнай падачы традыцыйнага мастацтва. Ім трэба акунуць гледача ў гушчу падзей, зрабіць яго ўдзельнікам агульнага свята, якім з'яўляецца фальклор, змяніць напрамак аб'ектыва, каб адлюстраваць кругаварот і магію танца, самую дробную змену выразу твараў выканаўцаў. Не выносіць традыцыйныя танцы на сцэнічную пляцоўку, а акружыць харэаграфічнае дзеянне колам гледачоў, толькі так можна перадаць камерную атмасферу калектыўнага выканання, не зніжаючы годнасць фальклорнага твора. Трэба таксама звярнуць увагу на дзейнасць расійскіх калег, асабліва стваральнікаў перадачы «Играй, гармонь любимая». Звярнуцца за дапамогай да кіраўнікоў раёнаў, дзеля таго, каб найшырэй прадставіць дзейнасць фальклорных калектываў, разнабаковасць традыцыйных танцавальных жанраў, адметнасць і своеасаблівасць традыцый і культуры рэгіёнаў і пазнаёміць гледачоў з творчасцю народных майстроў Беларусі.

Вялікую ролю ў вырашэнні праблемы маральна-эстэтычнага развіцця асобы павінна адыграць увядзенне школьнай і дашкольнай адукацыі на аснове беларускай культуры, азнаямленне навучэнцаў з узорамі беларускага дзіцячага фальклору, выхаванне іх ва ўмовах калектыўнай гульні, выканання масавых гульнявых карагодаў і танцаў, прыпевак і песень, вывучэнне асаблівасцей культуры, музычнай і харэаграфічнай творчасці, народнага адзення, рамёстваў, побыту розных рэгіёнаў Беларусі. Аднак тут паўстае яшчэ адна праблема: падрыхтоўка педагагічных кадраў, якія не толькі авалодаюць аб'ёмам гэтых ведаў, але і засвояць прынцыпы народнай педагогікі, дзе існуе непасрэдная сувязь працэсаў выхавання і творчасці. Толькі комплекснае вырашэнне ўсіх гэтых праблем, а таксама зацікаўленасць бацькоў у тым, на якіх ідэалах і якімі сродкамі выхоўваюцца іх дзеці, гарантуе, што нашы нашчадкі не страцяць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыі дабра і прыгажосці, і ў наступным стагоддзі беларуская культура не загіне ў вялікай колькасці сусветных культур.

О.П. Чудайкина

## ЭСТЕТИЧЕСКОЕ ФОРМИРОВАНИЕ ЛИЧНОСТИ СРЕДСТВАМИ ХОРЕОГРАФИИ

В процессе эстетического воспитания нашего общества хореографическое искусство занимает, бесспорно, одно из ведущих мест. Хореография приобретает в современную эпоху большое значение не только как художественное явление, но и гораздо шире - как система воспитания и реабилитации, доказавшая свою состоятельность и продолжающая искать новые формы воздействия на психофизическую сферу жизни человека.

Замечено, что для каждого субъекта общества в определенный момент особую важность приобретает процесс адаптации, умение ориентироваться в сложном мире человеческих взаимоотношений, познание добра и зла, формирование собственной жизненной позиции. Основополагающая роль в этом процессе отводится искусству, ибо творчество индивида, занятия различными видами искусства способствуют воспитанию нравственности, патриотизма, гуманизма, чувства собственного достоинства и собственной значимости для окружающего мира. Наряду с музыкой, изобразительным искусством и театром особое место в развитии творческих способностей занимает хореография. Человек, знакомый с искусством танца, осознает красоту движений, гармонию музыки и пластики, он стремится выражать свои эмоции через организованное, эстетически оформленное пластическое движение.

Традиции танца имеют давние исторические корни, еще древние греки высоко ценили этот вид искусства именно потому, что оно не только доставляет наслаждение, но и воспитывает душу и прекрасно “оформляет тело”. Более того, они почитали танцы как первое и древнейшее искусство, которое заключало в себе многие другие - музыку, живопись, скульптуру, а также науки - геометрию, философию, риторику. И даже если древние люди и переоценивали практическую пользу от искусства в том или ином конкретном случае, они, несомненно, были правы, считая искусство средством воздействия на жизнь.

Искусство прокладывало путь к обретению власти над реальностью, и реальность воспроизводилась с максимально возможной для тех времен тщательностью. Главным свойством искусства поначалу было подражание. Но позже в обрядовые танцы включались движения и прыжки, которые отражали внутреннее чувство человека, преобра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ